9(W2) „1941-1945"
У-74

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА ПЕРАМОГІ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1945

9(И)4
4 74

*Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!*

# УСЕНАРОДНАЕ СВЯТА ПЕРАМОГІ

34000

*ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР*
*МІНСК 1945*

Бібліятэка БССР імя А. М. Горкага

Инв.
1954 г.

# Свята перамогі

Перамога!

Маланкай абляцела нашу краіну вялікае, светлае радаснае слова: Перамога!

Вялікая Айчынная вайна пабеданосна завершана. Гітлераўская Германія поўнасцю разгромлена Чырвонай Арміяй і арміямі нашых саюзнікаў. У пакоранай совецкімі воінамі германскай сталіцы, у Берліне, Маршал Совецкага Саюза Жукаў і прадстаўнікі экспедыцыйных сіл саюзнікаў прадыктавалі нямецкаму вярхоўнаму камандаванню ўмовы капітуляцыі. Нямецка-фашысцкая армія спыніла сваё існаванне. Гітлераўская разбойніцкая дзяржава разбіта ўшчэнт.

Пачата новая старонка ў гісторыі чалавецтва. Залатымі літарамі ўпісаны ў яе подзвігі герояў Чырвонай Арміі. Слава ёй, вызваліцельніцы народаў!

Слава творцу перамог Чырвонай Арміі, слава геніяльнаму палкаводцу, мудраму правадыру таварышу Сталіну!

Святая, правая справа свабоды народаў, іх незалежнасці, іх супрацоўніцтва і дружбы перамагла фашысцкае зверства. Дарэмны былі спробы ворага раз'еднаць народы ў іх барацьбе супроць гітлераўскай Германіі. Праваліліся ўсе правакатарскія хітраванні. Чырвоная Армія разбурыла чорныя замыслы ворага. Германскія ўзброеныя сілы капітуліравалі адначасова перад Чырвонай Арміяй і нашымі саюзнікамі.

Вяліка ўрачыстасць совецкага народа. Сонца 9 мая асвятляе святочную нашу краіну. Таварыш Сталін у цяжкія дні вайны гаварыў, што прыдзе і на нашу вуліцу свята. І вось

гэта свята прышло ў блеску вясны, у яркіх праменнях нашай перамогі!

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР дзень 9 мая «ў азнаменаванне пабеданоснага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны совецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і атрыманых гістарычных перамог Чырвонай Арміі, якія закончыліся поўным разгромам гітлераўскай Германіі», аб'яўлен днём усенароднай урачыстасці, святам Перамогі. Сёння ўпершыню змоўкнуць гарматы на франтах Еўропы. Прышоў той шчаслівы дзень, якога народы нашай краіны чакалі амаль чатыры гады.

Бязмерны радасць і шчасце нашы!

Мы вітаем вас, нашы героі на фронце, бясстрашныя абаронцы нашай совецкай Радзімы! Вы праславілі яе ў вяках. Вы паказалі свету, што можа зрабіць Чырвоная Армія, выпеставаная бальшэвіцкай партыяй, кіруемая генераламі сталінскай школы.

Мы вітаем вас, самаадданыя работнікі тыла! Вы праславілі сваю Радзіму бяспрыкладнай працай. Вы паказалі свету, на што здольна Совецкая дзяржава, створаная Леніным і Сталіным!

Мы славім бяссмертную памяць герояў нашых, паўшых у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Айчыны. На іх подзвігах, на іх самаадданай барацьбе за Радзіму будуць выхоўвацца пакаленні совецкага народа.

Мы святкуем перамогу Чырвонай Арміі, і разам з намі святкуюць вызваленыя ёю народы Еўропы. Наша ўсенародная ўрачыстасць зліваецца з урачыстасцю брацкіх славянскіх народаў. Дружба народаў, змацаваная крывёю на агульных палях бітвы супроць заклятага ворага славянства, дае свае багатыя плады.

Мы святкуем перамогу Чырвонай Арміі, і разам з намі радуюцца ўсе свабодалюбівыя народы, нашы саюзнікі. Разгром гітлераўскай Германіі паказаў, што няма такой варожай сілы, якая ўстаяла-б перад націскам аб'еднаных нацый, натхнёных высокімі ідэямі абароны цывілізацыі, культуры, дэмакратыі.

Мы горды тым, што Чырвонай Арміі, усяму нашаму народу належыць галоўная, рашаючая роля ў разгроме нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Мы перажылі цяжкія гады, мы панеслі велізарныя страты ад нямецка-фашысцкага зверства, ад разбурэння нашых гарадоў і сёл, заводаў і калгасаў. Але магутны і невычарпальны сілы Совецкай дзяржавы.

Загартаваўшымся ў ваенных працах, моцным, трывалым выходзіць совецкі народ з Вялікай Айчыннай вайны. З любоўю аглядае ён сваю краіну. Вялікая прадстаіць праца. Атрымана гістарычная перамога, вораг разгромлен, але трэба замацаваць плады перамогі. Таварыш Сталін гаварыў:

«Выйграць вайну з Германіяй значыць ажыццявіць вялікую гістарычную справу. Але выйграць вайну яшчэ не значыць забяспечыць народам трывалы мір і надзейную безапаснасць у будучым. Задача заключаецца не толькі ў тым, каб выйграць вайну, але і ў тым, каб зрабіць немагчымым узнікненне новай агрэсіі і новай вайны, калі не назаўсёды, то па крайняй меры на працягу доўгага перыяду часу».

У душу народа глыбока ўвайшлі мудрыя, праніклівыя словы любімага нашага правадыра. Мы помнім іх у вайне і ў міры, ва ўрачыстасці свята Перамогі і ў буднях напружанай працы. Мы ведаем, што Перамога не прышла сама сабой. Яна атрымана самаадданасцю, гераізмам, воінскім майстэрствам Чырвонай Арміі і ўсяго совецкага народа. Яе арганізавала наша непераможная большэвіцкая партыя, партыя Леніна — Сталіна, да яе прывёў нас вялікі Сталін.

Наша свята Перамогі — гэта ўрачыстасць свабодалюбівых народаў. Народы свету ведаюць, каму яны абавязаны сваім выратаваннем ад знішчэння, ад фашысцкага рабства.

Няхай жыве наша Радзіма, няхай красуецца яна сярод народаў свету,—аплот іх незалежнасці і свабоды!

Няхай жыве наша вялікая сталінская Перамога!

*(«Правда» за 9 мая 1945 г.)*

## *ПАДПІСАННЕ АКТА*
## *аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл*

# Акт аб ваеннай капітуляцыі

1. Мы, ніжэйпадпісаўшыяся, дзейнічаючы ад імені Германскага Вярхоўнага Камандавання, згаджаемся на безагаворачную капітуляцыю ўсіх нашых узброеных сіл на сушы, на моры і ў паветры, а таксама ўсіх сіл, якія знаходзяцца ў сучасны момант пад нямецкім камандаваннем, — Вярхоўнаму Галоўнакамандаванню Чырвонай Арміі і адначасова Вярхоўнаму Камандаванню Саюзных экспедыцыйных сіл.

2. Германскае Вярхоўнае Камандаванне неадкладна выдасць загады ўсім нямецкім камандуючым сухапутнымі, марскімі і паветранымі сіламі і ўсім сілам, якія знаходзяцца пад германскім камандаваннем, спыніць ваенныя дзеянні ў 23-01 гадзіны па цэнтральна-еўрапейскаму часу 8 мая 1945 года, астацца на сваіх месцах, дзе яны знаходзяцца ў гэты час, і поўнасцю раззброіцца, перадаўшы ўсю іх зброю і ваенную маёмасць мясцовым саюзным камандуючым або афіцэрам, выдзеленым прадстаўнікамі Саюзнага Вярхоўнага Камандавання, не разбураць і не прычыняць ніякіх пашкоджанняў параходам, суднам і самалётам, іх рухавікам, карпусам і абсталяванню, а таксама машынам, узбраенню, апаратам і ўсім наогул ваенна-тэхнічным сродкам вядзення вайны.

3. Германскае Вярхоўнае Камандаванне неадкладна вы-

дзеліць адпаведных камандзіраў і забяспечыць выкананне ўсіх далейшых загадаў, выданых Вярхоўным Галоўнакамандаваннем Чырвонай Арміі і Вярхоўным Камандаваннем Саюзных экспедыцыйных сіл.

4. Гэты акт не будзе з'яўляцца перашкодай да замены яго другім генеральным дакументам аб капітуляцыі, заключаным Аб'еднанымі Нацыямі або ад іх імені, прымянімым да Германіі і германскіх узброеных сіл у цэлым.

5. У выпадку, калі нямецкае Вярхоўнае камандаванне або якія-небудзь узброеныя сілы, якія знаходзяцца пад яго камандаваннем, не будуць дзейнічаць у адпаведнасці з гэтым актам аб капітуляцыі, Вярхоўнае Камандаванне Чырвонай Арміі, а таксама Вярхоўнае Камандаванне Саюзных экспедыцыйных сіл, прадпрымуць такія карныя меры, або іншыя дзеянні, якія яны палічаць неабходнымі.

6. Гэты акт складзен на рускай, англійскай і нямецкай мовах. Толькі рускі і англійскі тэксты з'яўляюцца аўтэнтычнымі.

Падпісана 8 мая 1945 года ў гор. Берліне.

Ад імені Германскага Вярхоўнага Камандавання:
КЕЙТЭЛЬ, ФРЫДЭБУРГ, ШТУМПФ.

У прысутнасці:

Па ўпаўнаважанню Вярхоўнага Галоўнакамандавання Чырвонай Арміі Маршала Совецкага Саюза
Г. ЖУКАВА.

Па ўпаўнаважанню Вярхоўнага Камандуючага экспедыцыйнымі сіламі саюзнікаў Галоўнага Маршала Авіяцыі
ТЭДЭРА.

Пры падпісанні таксама прысутнічалі ў якасці сведак:

Камандуючы стратэгічнымі паветранымі сіламі ЗША
генерал СПААТС.

Галоўнакамандуючы французскай арміяй
генерал Дэлатр дэ ТАСІНЫ.

# УКАЗ
## Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
## аб аб'яўленні 9 мая святам перамогі

У азнаменаванне пабеданоснага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны совецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і атрыманых гістарычных перамог Чырвонай Арміі, якія ўвянчаліся поўным разгромам гітлераўскай Германіі, заявіўшай аб безагаворачнай капутіляцыі, устанавіць, што 9 мая з'яўляецца днём усенароднага таржаства — СВЯТАМ ПЕРАМОГІ.

9 мая лічыць нерабочым днём.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль.
8 мая 1945 г.

# *У Соўнаркоме СССР*

У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб аб'яўленні 9 мая СВЯТАМ ПЕРАМОГІ Соўнарком СССР пастанавіў лічыць 9 мая 1945 года нерабочым днём.

Совет Народных Камісараў СССР прапанаваў усім совецкім дзяржаўным установам 9 мая г. г. у дзень усенароднага таржаства — СВЯТА ПЕРАМОГІ ўзняць на сваіх будынках Дзяржаўны Флаг Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

# Зварот таварыша І. В. Сталіна да народа

***Таварышы! Суайчыннікі і суайчынніцы!***

Наступіў вялікі дзень перамогі над Германіяй. Фашысцкая Германія, пастаўленая на калені Чырвонай Арміяй і войскамі нашых саюзнікаў, прызнала сябе пераможанай і аб'явіла безагаворачную капітуляцыю.

7 мая быў падпісан у горадзе Рэймсе папярэдні пратакол капітуляцыі. 8 мая прадстаўнікі нямецкага галоўнакамандавання ў прысутнасці прадстаўнікоў Вярхоўнага Камандавання саюзных войск і Вярхоўнага Галоўнакамандавання совецкіх войск падпісалі ў Берліне канчатковы акт капітуляцыі, выкананне якога пачалося з 24 гадзін 8 мая.

Ведаючы воўчую павадку нямецкіх заправіл, якія лічаць дагаворы і пагадненні пустой паперкай, мы не маем падставы верыць ім на слова. Аднак сёння з раніцы нямецкія войскі ў выкананне акта капітуляцыі сталі ў масавым парадку складваць зброю і здавацца ў палон нашым войскам. Гэта ўжо не пустая паперка. Гэта — сапраўдная капітуляцыя ўзброеных сіл Германіі. Праўда, адна група нямецкіх войск у раёне Чэхаславакіі ўсё яшчэ ўхіляецца ад капітуляцыі. Але я спадзяюся, што Чырвонай Арміі ўдасца прывесці яе да розуму.

Цяпер мы можам з поўнай падставай заявіць, што наступіў гістарычны дзень канчатковага разгрому Германіі, дзень вялікай перамогі нашага народа над германскім імперыялізмам.

Вялікія афяры, прынесеныя намі ў імя свабоды і незалежнасці нашай Радзімы, незлічоныя нястачы і пакуты, перажытыя нашым народам у ходзе вайны, напружаная праца ў тылу і на фронце, адданая на алтар Айчыны,—не прайшлі дарэмна і ўвянчаліся поўнай перамогай над ворагам. Векавая барацьба славянскіх народаў за сваё існаванне і сваю незалежнасць закончылася перамогай над нямецкімі захопнікамі і нямецкай тыраніяй.

З гэтага часу над Еўропай будзе развявацца вялікі сцяг свабоды народаў і міру паміж народамі.

Тры гады назад Гітлер усенародна заявіў, што ў яго задачы ўваходзіць расчляненне Совецкага Саюза і адрыў ад яго Каўказа, Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і іншых абласцей. Ён прама заявіў: «Мы знішчым Расію, каб яна больш ніколі не змагла падняцца». Гэта было тры гады назад. Але сумазбродным ідэям Гітлера не суджана было здзейсніцца, — ход вайны развеяў іх у прах. На справе атрымалася нешта прама процілеглае таму, аб чым брэдзілі гітлераўцы. Германія разбіта нагалаву. Германскія войскі капітуліруюць. Совецкі Саюз таржаствуе перамогу, хоць ён і не збіраецца ні расчляняць, ні знішчаць Германію.

Таварышы! Вялікая Айчынная вайна завяршылася нашай поўнай перамогай. Перыяд вайны ў Еўропе скончыўся. Пачаўся перыяд мірнага развіцця.

З перамогай вас, мае дарагія суайчыннікі і суайчынніцы!

СЛАВА НАШАЙ ГЕРАІЧНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, АДСТАЯЎШАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ НАШАЙ РАДЗІМЫ І ЗАВАЯВАЎШАЙ ПЕРАМОГУ НАД ВОРАГАМ!

СЛАВА НАШАМУ ВЯЛІКАМУ НАРОДУ, НАРОДУ-ПЕРАМОЖЦУ!

ВЕЧНАЯ СЛАВА ГЕРОЯМ, ПАЎШЫМ У БАЯХ З ВОРАГАМ І АДДАЎШЫМ СВАЁ ЖЫЦЦЁ ЗА СВАБОДУ І ШЧАСЦЕ НАШАГА НАРОДА!

## *ЗАГАД*
## *Вярхоўнага Галоўнакамандуючага*
# па войсках Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту

8 мая 1945 года ў Берліне прадстаўнікамі германскага вярхоўнага камандавання падпісан акт аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл.

Вялікая Айчынная вайна, якую вёў совецкі народ супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пабеданосна завершана, Германія поўнасцю разгромлена.

Таварышы чырвонаармейцы, чырвонафлотцы, сержанты, старшыны, афіцэры арміі і флота, генералы, адміралы і маршалы, віншую вас з пабеданосным завяршэннем Вялікай Айчыннай вайны.

У азнаменаванне поўнай перамогі над Германіяй сёння, 9 мая, у Дзень Перамогі, у 22 гадзіны сталіца нашай Радзімы Масква ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам Чырвонай Арміі, караблям і часцям Ваенна-Марскога Флота, атрымаўшым гэтую бліскучую перамогу, — трыццаццю артылерыйскімі залпамі з тысячы гармат.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Няхай жывуць пабеданосныя Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот!

Вярхоўны Галоўнакамандуючы
Маршал Совецкага Саюза

І. СТАЛІН.

9 мая 1945 года.
№ 369.

## *УКАЗ*

## *Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР*

# аб устанаўленні медалі „За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.“

1. У азнаменаванне атрыманай перамогі над Германіяй устанавіць медаль «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.».

2. Зацвердзіць Палажэнне аб медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.».

3. Зацвердзіць Апісанне медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль
9 мая 1945 г.

## ПАЛАЖЭННЕ

# аб медалі „За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.“

1. Медаллю «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» узнагароджваюцца:

а) усе ваеннаслужачыя і асобы вольнанаёмнага штатнага састава, прымаўшыя ў радах Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і войск НКУС непасрэдны ўдзел на франтах Айчыннай вайны або забяспечваўшыя перамогу сваёй работай у ваенных акругах;

б) усе ваеннаслужачыя і асобы вольнанаёмнага штатнага састава, служыўшыя ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў радах дзеючай Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і войск НКУС, але выбыўшыя з іх па раненню, хваробе і калецтву, а таксама пераведзеныя па рашэнню дзяржаўных і партыйных арганізацый на іншую работу па-за арміяй.

2. Уручэнне медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» праводзіцца ад імені Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР на падставе дакументаў, пацвярджаючых удзел у Вялікай Айчыннай вайне, выдаваемых камандзірамі часцей, начальнікамі ваенна-лячэбных устаноў і выканкомамі адпаведных абласных і гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных.

Уручэнне праводзіцца: асобам, якія знаходзяцца ў вайсковых часцях Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флота і

войск НКУС, камандзірамі вайсковых часцей, а асобам, выбыўшым з арміі, флота і войск НКУС, — абласнымі, гарадскімі і раённымі ваеннымі камісарамі па месцу жыхарства ўзнагароджаных.

3. Медаль «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» носіцца на левым баку грудзей. Пры наяўнасці ордэнаў і другіх медалей названая медаль размяшчаецца пасля медалі «За оборону Советского Заполярья».

★

## *Апісанне*

## медалі „За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.“

Медаль круглая, вырабляецца з латуні. На ліцавым баку медалі профільнае пагруднае ізабражэнне таварыша І. В. Сталіна ў форме Маршала Савецкага Саюза. У верхняй частцы медалі па акружнасці надпіс: «Наше дело правое», у ніжняй частцы па акружнасці надпіс: «Мы победили».

На адваротным баку медалі надпісы: па акружнасці — «За победу над Германией», у цэнтры — «в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.», у ніжняй частцы — пяціканцовая зорачка.

Ізабражэнне і надпісы на медалі выпуклыя.

Размер медалі 32 мм у дыяметры.

Медаль пры дапамозе вушка і кальца злучана з пяцівугольнай калодачкай, абцягнутай шаўковай муаравай лентай шырынёй у 24 мм. На ленце 5 прадоўжных роўных па шырыні палосак, якія чаргуюцца, — 3 чорнага і 2 аранжавага колеру. Краі ленты акаймлёны вузенькімі аранжавымі палоскамі.

---

ЗМЕСТ

Стар.

Свята перамогі . . . 3

Падпісанне акта аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл . . . 6

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб аб'яўленні 9 мая Святам Перамогі . . . 8

У Соўнаркоме СССР . . . 9

Зварот таварыша І. В. Сталіна да народа . . . 10

Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага па войсках Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту . . . 12

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб устанаўленні медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» . . . 13

Палажэнне аб медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» . . . 14

Апісанне медалі «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941 — 1945 гг.» . . . 15

Адказны за выпуск **Д. Т. Лебедзеў**

АТ 29166 Падпісана да друку 16/V—45 Тыраж 10 тыс. экз.
Фармат паперы 60 × 84/16 Аб'ём 1,0 аўт. арк.
Друк арк. 1,0 Заказ № 1057

Друкарня імені Сталіна, Мінск, вул. Пушкіна 55.

ЦАНА 45 кап